УДК 94(476-15)"1919/1939"

*М. А. Бяспалая*

# Заходняя Беларусь («Усходнія Крэсы»): два дзесяцігоддзі выпрабаванняў

*Артыкул прымеркаваны да 80-годдзя аб'яднання беларускага народа ў адзінай дзяржаве. На аснове аналізу палітыкі міжваеннай Польшчы адлюстравана спроба польскіх улад вырашыць беларускае пытанне на акупіраванай падчас вайны (1919–1920) тэрыторыі БССР, раскрыта эканамічная і сацыяльна-культурная сітуацыя ў заходнебеларускіх ваяводствах. Звернута ўвага на ролю Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры і Таварыства беларускай школы ў развіцці адукацыі і культуры.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Даследчыкамі савецкага і постсавецкага перыяду, у тым ліку прадстаўнікамі беларускай навуковай школы, ажыццёўлены дастаткова грунтоўны аналіз становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы. Так, У. Ф. Ладысеў, І. В. Палуян, А. І. Борка, А. Л. Дарковіч, А. Л. Радзюк, К. С. Разуванава і іншыя вывучалі эканамічныя, сацыяльна-палітычныя аспекты яе развіцця.

Аўтар ставіць задачу паказаць дыскрымінацыйную сутнасць эканамічнай і культурнай палітыкі польскіх улад, яе адмоўныя вынікі і адлюстраваць існаванне шырокіх антыпольскіх настрояў сярод беларускага насельніцтва на тэрыторыі ўсходніх крэсаў.

Адраджэнне Польскай дзяржавы і фарміраванне яе атрыбутаў, напрыклад арміі, адбывалася хутка, на працягу некалькіх тыдняў, з лістапада 1918 г. да пачатку 1919 г. Польскі ўрад не скрываў намер вярнуць усходнія тэрыторыі («крэсы»). Фармальнай падставай гэтага з'яўляліся вынікі перапісу 1897 г. у Расійскай імперыі, згодна з якімі ў Гародні пражывала 33 %, у губерні – 13,7 % палякаў, у Мінску – 11,4 %, у губерні – 10,1 %. Відавочна, што гэта значная колькасць, але далёка не большасць сярод мясцовага насельніцтва, таму прыведзеныя лічбы не маглі ўяўляць легітымную падставу далучэння дадзеных тэрыторый.

У асяроддзі правячых і палітычных колаў Польшчы сфарміраваліся два падыходы да гэтай праблемы: аўтанамісцкі, які прадугледжваў інкарпарацыю Заходняй і Цэнтральнай Беларусі ў склад Польшчы, і федэралісцкі – стварэнне саюзных з Польшчаю дзяржаў на тэрыторыі Украіны, Літвы і Беларусі і ўвядзенне мясцовага дэмакратычнага самакіравання. Прыхільнікам другога варыянта быў аўтарытэтны палітык Ю. Пілсудскі.

Падчас наступлення польскіх войск з лютага па восень 1919 г. была акупіравана значная тэрыторыя БССР: лінія фронту праходзіла непадалёк ад Віцебска, Ельска і Мазыра, былі заняты Барысаў і Бабруйск. На гэтай тэрыторыі ўлада перайшла ў рукі польскай адміністрацыі.

Любыя антыпольскія настроі праследаваліся, на ўсе мясцовыя пасады прызначаліся выключна палякі, уводзіліся жорсткія рэквізіцыі, практыкаваліся арышты, рэпрэсіі сярод мясцовага насельніцтва. Напрыклад, у в. Гатава польскія легіянеры разбурылі пяць дамоў, а ўсіх жыхароў секлі розгамі; в. Корсікі была спалена; у в. Летніцы ўсіх жыхароў білі нагайкамі, трох чалавек расстралялі; у в. Дражно 32 жыхары былі забіты і г. д. 7 мая 1920 г. непадалёк ад Мінска ў Камароўскім лесе былі расстраляны восем партызан; у мястэчку Грэск 24 красавіка расстралялі 14 партызан. Згодна з афіцыйнымі данымі савецкіх органаў, за 18 месяцаў польскай акупацыі ў васьмі паветах Цэнтральнай Беларусі пацярпелі ад рэпрэсій 158 000 чалавек [1, с. 78].

Польскія ўлады не збіраліся прызнаваць беларускія дзяржаўныя ўтварэнні – ні БНР, ні БССР. Ю. Пілсудскі заявіў, што ён згодны пагадзіцца з уступкамі беларусам у галіне культурнага развіцця, але «рабіць палітычныя на карысць беларускай фікцыі не хачу» [4, с. 184]. Заява аб падтрымцы беларускай культуры ў далейшым таксама аказалася фікцыяй.

Вайна 1919–1920 гг. завяршылася ў кастрычніку 1920 г. Для савецкай Беларусі прынцыпова важным з’яўлялася тэрытарыяльнае пытанне. У дэкларацыі аб другім абвяшчэнні БССР 31 ліпеня 1920 г. канстатавалася, што заходняя мяжа рэспублікі вызначаецца па этнаграфічнай граніцы. Аднак пасля заканчэння баявых дзеянняў лінія фронту ўстанавілася непадалёк ад Мінска. Абмеркаванне мяжы адбывалася паміж РСФСР і Польшчай, без удзелу БССР (ССРБ). На мірных перагаворах у Рызе савецкая дэлегацыя фактычна прайграла дыпламатычную вайну, таму што прыняла польскія ўмовы міру. Праўда, незалежнасць БССР была прызнана, але да Польшчы адышла Заходняя Беларусь. Дзяржаўная мяжа праходзіла непадалёк ад Мінска, станцыя Негарэлае з’яўлялася пагранічнай. Згодна з Рыжскім мірным пагадненнем да Польшчы адышла амаль палавіна тэрыторыі БССР з насельніцтвам 4,6 млн чалавек. Сярод іх беларусаў – 65 %, палякаў – 15 %, яўрэяў – 11 %.

Беларускія патрыёты востра адрэагавалі на падзел свайго краю. Так, нягледзячы на праследаванні польскіх улад з’явіліся вершы пратэснага характару У. Дубоўкі «Ты дэкляруеш мне долю…» (1922), Алеся Дудара «Пасеклі край наш папалам...» (1928) і інш.

Устанаўленне дзяржаўнай мяжы суправаджалася значнымі цяжкасцямі, таму што яна праходзіла там, дзе яе ніколі не было. У многіх мясцовасцях назіраліся выпадкі, калі вёска знаходзілася на адным баку мяжы, а яе палі ці сенажаці – на другім. Адзіны народ аказаўся разбіты на дзве часткі, што не магло не выклікаць імкненне да аб’яднання. Існавалі і іншыя складаныя праблемы, напрыклад, сотні тысяч бежанцаў Першай сусветнай вайны жадалі вярнуцца ў родныя мясціны. Толькі ў 1932 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адбылося канчатковае прававое афармленне дзяржаўнай мяжы паміж СССР і Польшчай [7, с. 7].

На далучанай тэрыторыі адначасова з такой жа рэформай у адноўленай Польшчы адбывалася адміністрацыйная рэформа. Пачаліся мэтанакіраваныя перамены, напрыклад, горад Бярэсце, ці Брэст-Літоўскі, у 1923 г. перайменаваны ў Брэст-над-Бугам. Тэрыторыя Заходняй Беларусі была падзелена на чатыры ваяводствы – Беластоцкае, Віленскае, Навагрудскае і Палескае, якія ўключалі 29 паветаў, а апошнія складаліся з гмін. На ўсёй тэрыторыі была створана адпаведная сетка паліцэйскіх участкаў – пастарункаў. За далучанай тэрыторыяй замацавалася назва «ўсходнія крэсы» (пол. Kresy Wschodnie).

Мясцовыя органы ўлады камплектаваліся ўраджэнцамі карэнных польскіх раёнаў. Яны не ўяўлялі спецыфікі сацыякультурнага стану Заходняй Беларусі, а большасць з іх не валодала неабходнымі якасцямі, што прыводзіла да ўсёдазволенасці і агрэсіўнасці ў паводзінах. За падборам кадраў у органы мясцовай улады цэнтр назіраў вельмі пільна, не дапускаючы ў іх прадстаўнікоў беларускага насельніцтва, што было зафіксавана і польскім заканадаўствам. Мэтай гэтай палітыкі была паланізацыя этнасу ўсходніх крэсаў. У гэтым працэсе найважнейшая роля надавалася сельскаму самакіраванню ў межах гміны. Яно складалася з сельскай грамады і грамадскага сходу на чале з солтысам, які падпарадкоўваўся войту, што ўзначальваў гміну. Солтыса і войта прызначаў павятовы стараста з жыхароў, лаяльных дзяржаўнай уладзе. Павятовы стараста прызначаўся ў Варшаве і валодаў фактычна неабмежаванай уладай, кантраляваў усе кірункі развіцця павета. Шырокімі паўнамоцтвамі ў межах ваяводства быў надзелены ваявода, які прызначаўся прэм'ер-міністрам Польшчы [2, с. 10–12]. Вядомы вучоны-гісторык беларускага замежжа Ю. Весялкоўскі, асэнсоўваючы падзеі таго часу, падкрэсліваў, што Заходняй Беларуссю кіравалі войт у гміне, камендант паліцыі на пастарунку, а ксёндз з амбона.

Адзначым, што пасля парламенцкіх выбараў 1922 г., на якіх нацыянальныя меншасці атрымалі значную колькасць галасоў, на ўсходніх тэрыторыях польскія ўлады чатыры гады не ўводзілі абяцанага па Канстытуцыі 1921 г. ні павятовага, ні гарадскога самакіравання. Адной з прычын мог стаць нездавальняючы вопыт выбараў у Мінскі гарадскі савет у жніўні 1919 г. Як паведамлялася, «нягледзячы на тэрор, <…> арышты рэквізіцыі <…> вынік адмоўны. <…> Большасць абраных настроены варожа да Польшчы. Беларусы не прымалі ўдзел у выбарах па прычыне адсутнасці грошай» [5, с. 106]. У далейшым мясцовая адміністрацыя кантралявала дзейнасць органаў павятовага самакіравання (рада і аддзел) у паветах, рады і магістратаў у гарадах, што не дазволіла ім рэалізаваць магчымасці самакіравання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Абвешчаную ў лістападзе 1918 г. Польскую дзяржаву ў навуковай і папулярнай літаратуры часта называюць II Рэччу Паспалітай. Аднак ад першай Рэчы Паспалітай 1569–1795 гг. яна адрознівалася ўнітарнасцю, аб федэралісцкіх сувязях з далучанымі тэрыторыямі не ўпаміналася, кіраўніцтва імі ажыццяўлялася з цэнтра. Улады не клапаціліся аб развіцці далучаных зямель, іх уздыме і давядзенні да ўзроўню польскіх рэгіёнаў. Многія мерапрыемствы польскага ўрада выразна адлюстроўваюць імкненне захаваць за Заходняй Беларуссю статус сыравіннай базы для польскай прамысловасці, ператварыць яе ў крыніцу таннай рабочай сілы.

Гарадская структура ўсходніх крэсаў уключала 39 гарадоў, у 18 з якіх пражывала да 5 тыс. насельніцтва, у 12 – ад 5 да 10 тыс., у 6 – ад 10 да 25 тыс. Самымі вялікімі гарадамі па колькасці насельніцтва былі Бярэсце – 47,5 тыс., Гродна – 48,5 тыс., Пінск – 32 тыс. Сярод гарадоў, якія дасягнулі даваеннага ўзроўню (1914), вылучаецца Ліда, якая ператварылася ў буйны чыгуначны вузел, што стымулявала рост прамысловасці і гарадскога насельніцтва. Паводле перапісу 1921 г. у гарадах пражывалі 46,1 % яўрэяў, 39,3 % палякаў, 12,8 % беларусаў і г. д. Доля гарадскога насельніцтва ў Заходняй Беларусі складала 11,8 %, а ў цэлым па краіне 27,2 % [4, с. 82, 85].

У сярэдзіне 1920-х гг. у беларускіх ваяводствах налічвалася 127 фабрык і заводаў з колькасцю рабочых больш за 20, толькі 89 прадпрыемстваў мелі больш за 100 рабочых, а шэсць – больш за 500. Найбуйнейшымі з іх былі шклозавод «Нёман», тытунёвая фабрыка ў Гародні, фабрыка гумавых вырабаў у Лідзе, «Прагрэс-Вулкан» у Пінску і інш. Амаль усе неабходныя тавары ўвозіліся з Польшчы. Прамысловасць Заходняй Беларусі напярэдадні Другой сусветнай вайны давала прадукцыі ў 9 разоў менш, чым БССР, хаця стартавыя ўмовы ў 1921 г. у абедзвюх частках Беларусі былі аднолькавыя. Замест рэфармавання прамысловасці на далучанай тэрыторыі рабаваліся прыродныя багацці. Напрыклад, ужо ў 1922 г. польскі ўрад прадаў прадпрымальнікам Англіі і Францыі права на распрацоўку драўніны ў Белавежскай пушчы і іншых месцах. За 1919–1939 гг. было высечана 589,2 тыс. га прамысловай драўніны. Запалкавая прамысловасць перадавалася ў арэнду шведскім, а тытунёвая – італьянскім прадпрымальнікам. У бюджэт краіны паступалі з Заходняй Беларусі сродкі, якія характарызавалі структуру вытворчасці: каля 60 % складала прадукцыя лясной гаспадаркі, 32 % – рыбнай і 12 % – жывёлагадоўлі [3, с. 353–355].

Сельская гаспадарка з'яўлялася асноўнай галіной, у якой працавала 80 % насельніцтва Заходняй Беларусі. Пасля далучэння да Польшчы была адноўлена памешчыцкая ўласнасць на зямлю. Больш за 55 % зямельнай плошчы, а з ляснымі ўгоддзямі да 70 % належала памешчыкам. Напрыклад, толькі Давыд-Гарадоцкі маярат князя К. Радзівіла



РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

складаў 155 200 га. Астатняя зямля размяркоўвалася паміж бядняцкімі гаспадаркамі, якіх налічвалася 284 706 і якія мелі надзелы да 10 га, 49 426 серадняцкіх гаспадарак апрацоўвалі ад 10 га да 20 га, і 15 107 багатых гаспадарак – ад 20 га да 50 га зямлі [11, с. 422].

Да 50 тыс. гаспадарак арандавалі зямлю агульнай плошчай да 52 тыс. га. Як бачым, памеры арэнды былі невялікія. Арэнда бралася пад частку ўраджаю і за адпрацоўку пэўных павіннасцей. У вёсцы былі распаўсюджаны адпрацоўкі за нарыхтоўку дроў, выпас жывёлы, за карыстанне сервітутамі (сенажацямі, выганам і інш.). На развіццё гаспадаркі адмоўна ўплывалі цераспалосіца, далёказямелле і г. д. Вёска пакутавала ад без- і малазямелля, нізкай агракультуры, якая грунтавалася на трохполлі.

Амаль палавіна працаздольнага насельніцтва заходнебеларускай вёскі, што складала прыкладна 700 тыс. чалавек, не была задзейнічана ў вытворчасці. Напрыклад, у Навагрудскім ваяводстве ў пачатку 1930-х гг. было зарэгістравана 3 тыс. гарадскіх і 280 тыс. вясковых беспрацоўных [5, с. 238]. Для многіх маладых людзей выйсце было адно – выезд на працу за мяжу. З 1926 г. па 1939 г. у працоўную эміграцыю выехала каля 212,5 тыс. чалавек [6, с. 15].

У ліпені 1925 г. быў выдадзены «Закон аб ажыццяўленні зямельнай рэформы», ці «Закон аб парцэляцыі і асадніцтве», які пацвердзіў яўную палітыку асіміляцыі і паланізацыі мясцовага насельніцтва. Каб дасягнуць гэтай мэты, у Заходняй Беларусі ўчасткі зямлі па 15–45 га перадаваліся ўраджэнцам карэннай Польшчы, гэтак званым асаднікам. На абзавядзенне гаспадаркай ім выдзяляліся доўгатэрміновыя льготныя крэдыты. Былыя афіцэры польскай арміі, чыноўнікі, іншыя заслужаныя людзі, нават польскія сяляне атрымлівалі гэтыя надзелы. У 1932 г. у Заходняй Беларусі пражывала 4640 ваенных асаднікаў, а калі дадаць амаль тры тысячы грамадзянскіх, то яны стваралі моцную апору ўлады і садзейнічалі паланізацыі беларусаў.

Па перапісе насельніцтва 1931 г. да палякаў аднеслі ўсіх беларусаў каталіцкага веравызнання ў заходнебеларускіх ваяводствах і нават праваслаўных. А 707 тыс. насельніцтва Палескага ваяводства (палешукоў) запісалі «тутэйшымі», як не маючых уяўлення аб сваёй нацыянальнай прыналежнасці. У выніку фальсіфікацыі перапісу 1931 г. у палякі было запісана 42 %, а ў беларусы – 22,5 % насельніцтва. Для параўнання адзначым, што па перапісе 1897 г., калі за падставу бралася родная мова, на гэтай тэрыторыі беларусамі па мове назвалі сябе 67 % насельніцтва [3, с. 370].

У Рыжскай дамове (красавік 1921 г.) утрымліваўся параграф аб гарантыях нацыянальных правоў: «Польшча дае асобам рускай, украінскай і беларускай нацыянальнасці, якія знаходзяцца ў Польшчы, на аснове раўнапраўя нацыянальнасцей, усе правы, што забяспечваюць свабод-

РЭПОЗІТОРИЙ БГУКИ

нае развіццё культуры, мовы і выкананне рэлігійных абрадаў. Узаемна Расія і Украіна забяспечваюць асобам польскай нацыянальнасці, якія знаходзяцца ў Расіі, Украіне і Беларусі, усе ж тыя правы» [9, с. 625–626]. Савецкі бок пагадзіўся на рэстытуцыю каштоўнасцей, вывезеных з Рэчы Паспалітай (на самай справе з беларускіх зямель, якія ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі ў выніку трох падзелаў РП), а таксама эвакуіраваных з яе тэрыторыі ў гады Першай сусветнай вайны. РСФСР павінна была выплаціць Польшчы 30 млн рублёў золатам за яе ўклад у расійскую эканоміку [9, с. 650].

Аднак і ў галіне культуры ўмовы Рыжскага міру не выконваліся.

Найбольш актыўна паланізацыя і асіміляцыя заходнебеларускага насельніцтва адбывалася праз сістэму адукацыі. У 1918–1919 гг. на тэрыторыі Заходняй Беларусі дзейнічала каля 400 беларускіх школ. Акупацыйныя польскія ўлады 7 лютага 1919 г. выдалі Дэкрэт «Аб школьным абавязку», якім абвяшчалася ўвядзенне 7-гадовага пачатковага навучання, як і ў карэннай Польшчы. Аднак гэты дакумент меў цікавае ўдакладненне: «Беларускім школам належыць даць субсідыі, калі аб'ектыўна знойдзецца пэўная колькасць жадаючых вучыцца на беларускай мове» [10, с. 49]. Польскія ўлады пасля 1921 г. паступова пачалі забараняць беларускія школы, настаўнікі-беларусы пазбаўляліся працы, пасля курсаў перападрыхтоўкі іх накіроўвалі ва ўнутраныя раёны Польшчы.

Пад націскам беларускага руху ў 1927–1928 гг. у заходнебеларускіх ваяводствах адкрылі 92 беларускія і 49 польска-беларускіх школ, у 1934 г. засталося 16. У 1932–1934 гг. дзейнічала 8 беларускіх гімназій у Радашковічах, Клецку, Навагрудку і іншых гарадах, якія паступова таксама зачыняліся. У самай буйной гімназіі ў Вільні навучалася да 200 чалавек. Але пазней яна была пераўтворана ў філіял польскай. Былі закрыты дзве настаўніцкія семінарыі (у Барунах і Свіслачы). У 1939 г. не засталося ніводнай беларускай школы [11, с. 423]. Па рашэнні цэнтральнай улады пасля смерці Ю. Пілсудскага ў кожным ваяводстве было запланавана стварэнне 100 «школ-помнікаў» імя Пілсудскага [4, с. 250]. Аднак і польскіх школ не хапала, амаль 13 % дзяцей увогуле нідзе не вучыліся. Згодна перапісу 1921 г. непісьменных у Навагрудскім ваяводстве налічвалася 55 %, у Палескім – 71 %, у 1931 г. – адпаведна 39 % і 50 % [5, с. 242–243].

Пасля майскага перавароту 1926 г. была абнародавана ідэя «дзяржаўнай асіміляцыі», якая грунтавалася на канцэпцыі фарміравання палітычнай нацыі. Яна прадугледжвала стварэнне дзяржавай спрыяльных умоў для развіцця нацыянальнай культуры і адукацыі «меншынствам, якія пражывалі ў яе межах, пры ўмове іх лаяльнасці да дзяржавы», а таксама паляпшэння эканамічнага стану [Там жа, с. 37]. Аднак спрыяльных вынікаў улады не дасягнулі. З канца 1920-х гг. яны адмовіліся ад уступак



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жыхарам крэсаў, якія прадугледжваліся згаданай праграмай, і вярнуліся да нацыянальнай палітыкі, накіраванай на хуткую асіміляцыю.

Першай масавай культурнай і асветніцкай установай ва ўсходніх крэсах з'явілася створанае ў 1921 г. *Таварыства беларускай школы (ТБШ)*. У пачатку 1930-х гг. яно складалася з 500 гурткоў і 30 тыс. актывістаў. Асноўныя задачы, якія вырашала Таварыства ў гэты перыяд, – пашырэнне пісьменнасці, адкрыццё беларускіх школ, стварэнне клубаў, бібліятэк, арганізацыя мастацкай самадзейнасці і інш. У рабоце ТБШ прымалі ўдзел многія выдатныя прадстаўнікі беларускага нацыянальнага руху: аўтар беларускай граматыкі, вучоны Б. Тарашкевіч, вядомы збіральнік народнага музычнага фальклору, кіраўнік хору Р. Шырма, паэты Я. Скурко (Максім Танк), В. Таўлай, пісьменнік П. Пястрак і інш. У 1927 г. ТБШ легальна выдавала 27 часопісаў і газет на беларускай мове, а ў 1932 г. толькі шэсць. У 1937 г. яго дзейнасць была забаронена.

У лютым 1924 г. была зарэгістравана «*Беларуская драматычная майстроўня*» на чале з Ф. Аляхновічам, якая мела на мэце заснаваць тэатр, бібліятэку, ладзіць тэатральныя пастаноўкі, спектаклі, вечарыны, экскурсіі. Удзельнікі майстроўні стварылі хор, ставілі спектаклі, запрашалі з лекцыямі вядомых творцаў. Напрыклад, 12 красавіка 1924 г. Язэп Драздовіч чытаў лекцыю «Старадаўняе будаўніцтва на Беларусі». Аднак ужо ў лютым 1925 г. майстроўня была распушчана.

Аналізу разнастайнай культурна-асветніцкай дзейнасці *Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры*, створанага ў 1926 г. па ініцыятыве беларускай інтэлігенцыі, і праіснаваўшага да 1936 г., прысвечана дысертацыя К. С. Разуванавай [8]. Эмпірычны матэрыял, выкарыстаны аўтарам у дысертацыі, унікальны, ён дапоўніў хрэстаматыйныя прыклады аб культурным жыцці ў Заходняй Беларусі.

Дарэчы, Інстытут нягледзячы на дзейнасць у неспрыяльных сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных умовах падтрымліваў краёвае земляробства, народныя рамёствы, садзейнічаў пашырэнню і развіццю культуры, асветы і навукі. БІГіК праз прэсу і звароты да польскіх улад падкрэсліваў самастойнасць і нежаданне ўдзельнічаць у палітычных акцыях. У арганізацыі культурна-асветных мерапрыемстваў ён узаемадзейнічаў з КПЗБ, Беларускім сялянскім саюзам, але самымі шырокімі былі стасункі з ТБШ. Яны праводзілі сумесныя акцыі па адкрыцці беларускіх школ, захаванні нацыянальнай адметнасці, супрацоўнічалі ў галіне літаратурнай, музычнай, навукова-даследчай дзейнасці.

Работа БІГіК была накіравана на развіццё адукацыі і культуры. У асветніцкім кірунку ладзіліся публічныя лекцыі па пытаннях аховы здароўя, кааператыўнага руху, гісторыі і культуры Беларусі, агратэхнічнай культуры. Сярод сяброў БІГіК былі распаўсюджаны выезды ў правінцыю з чытаннямі рэфератаў і лекцый на гістарычныя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і нацыянальна-культурныя тэмы, дакладаў аб жыцці і творчым шляху буйных дзеячаў беларускай навукі і культуры мінулага і сучаснасці, з кансультацыямі па лячэнні розных захворванняў.

Важнае значэнне ў дзейнасці БІГіК па развіцці нацыянальнай самасвядомасці мелі вечарыны, прысвечаныя ўшанаванню памяці найбольш значных дзеячаў навукі, літаратуры, гісторыі і культуры Беларусі: М. Багдановіча, Б. Эпімах-Шыпілы, М. Нікіфароўскага, Я. Коласа, Цёткі, Ф. Багушэвіча і інш. Адзначаліся 400-годдзе Статута Вялікага Княства Літоўскага 1529 г., 70-годдзе выдання «Мужыцкай праўды» і інш. Праводзіліся вечарыны, прысвечаныя беларускай песні і паэзіі, святам беларускага гаспадарчага календара, разнастайным грамадска-палітычным і культурным падзеям (выбарам у польскі сейм, рэформе беларускага правапісу ў БССР і інш.).

Інстытут некаторы час утрымліваў дзве пачатковыя школы, каапературыўна-гандлёвыя курсы, планаваў адкрыць настаўніцкую семінарыю. Удзельнікі інстытуцкіх гурткоў збіралі прадметы побыту, запісвалі народныя песні, паданні, прымаўкі. На падставе сабраных калекцый спрабавалі стварыць музей, праца ў гэтым кірунку пачалася ў 1934 г.

У інстытуцкай бібліятэцы-чытальні на пачатак 1930 г. налічвалася 427 кніг, мноства выпускаў часопісаў на беларускай, рускай, польскай, украінскай і літоўскай мовах. Мясцовыя бібліятэкі-чытальні таксама існавалі пры інстытуцкіх гуртках. Найбольш значнымі чытальнямі валодалі гурткі ў вёсках Цяцеркі Браслаўскага павета, Жодзішкі Вілейскага павета, Шутавічы Ашмянскага павета, м. Будслаў Вілейскага павета. БІГіК пастаянна імкнуўся папаўняць бібліятэкі гурткоў шляхам адпраўкі сваіх выданняў, дапамагаў развіццю бібліятэк у навучальных установах краю. Напрыклад, ён ахвяраваў 52 беларускія кнігі для беларускай гімназіі ў Навагрудку. Для падтрымкі і папаўнення фондаў цэнтральнай і правінцыйных бібліятэк Інстытут рабіў захады па наладжванні кнігаабмену з рознымі навукова-даследчымі ўстановамі Польшчы і БССР, а таксама вёў перапіску з імі аб перадачы танных або ўвогуле бясплатных экзэмпляраў. Так, са жніўня 1934 г. паміж БІГіК і Камісіяй па вывучэнні Заходняй Беларусі Акадэміі навук БССР быў наладжаны больш-менш трывалы кнігаабмен.

Ва ўмовах паланізацыі Заходняй Беларусі захаванне нацыянальных культурных здабыткаў, іх папулярызацыя сярод насельніцтва сталі неад'емнай часткай працы БІГіК. На працягу існавання ён ладзіў аматарскія тэатральныя паказы ў Вільні і ў правінцыі, дзе асноўная праца на тэатральнай ніве праводзілася яго мясцовымі суполкамі. Адным з найбольш вядомых калектываў з'яўляецца Беларускі аб'язны (вандроўны) тэатр (афіцыйная назва – *Беларускі народны тэатр Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры*). У планы трупы ўваходзіла правядзенне выязных спектакляў на тэрыторыі Віленскага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і Навагрудскага ваяводстваў. За няпоўны год дзейнасці артысты далі 65 выступленняў.

Для атрымання дазволу на пастаноўку спектакляў Інстытут быў абавязаны накіроўваць на рэцэнзію ў МУС Польшчы зборнік беларускіх п’ес. Сярод твораў, якія ўвайшлі ў зборнік, былі найбольш папулярныя на той час п’есы Ф. Аляхновіча, М. Чарота, С. Новіка-Пяюна, Л. Радзевіча, Я. Купалы, К. Сваяка, К. Вясёлага і інш. беларускіх аўтараў: «Боты», «Чорт і баба», «Пан Міністар», «Шчаслівы муж», «Страхі жыцця», «Птушка шчасця», «Мікітаў лапаць», «Пакой у наймы», «Паўлінка» і «Заручыны Паўлінкі», «Суд над трохпалёўкай», «Янка канцавы», «Не розумам сцяміў, а сэрцам», «Выбары старшыні» і інш.

Нягледзячы на значны поспех і адсутнасць сур’ёзных нараканняў з боку паліцыі, тэатр вымушаны быў спыніць існаванне: спачатку яму было адмоўлена ў атрыманні пастаяннага дазволу на спектаклі (кожны раз даводзілася прасіць яго ў адпаведнага мясцовага старасты), а пасля і ўвогуле дзейнасць тэатра была забаронена віленскім ваяводам. Апошні публічны спектакль трупы адбыўся 28 снежня 1928 г. у Вільні. На сцэне былі выкананы п’еса «Паўлінка» і беларускія песні.

У некаторых вёсках Заходняй Беларусі ствараліся аматарскія тэатральныя гурткі пад эгідай БІГіК. Так, тэатральная дзейнасць Шутавіцкага гуртка пачалася ў лістападзе 1926 г. (яны давалі да васьмі спектакляў у год у Шутавічах і суседніх вёсках). Праз два гады на яго базе была створана аматарская тэатральная трупа Смаргонскай гміны Ашмянскага павета. Трупа вяла актыўную гастрольную дзейнасць на тэрыторыі Ашмянскага павета (Вялікая Мыш, Свірыдавічы, Шутавічы, Межалі, Крэва і інш.), ладзіла ўласныя спектаклі і дапамагала ставіць пастаноўкі сялянскай моладзі. Так, 26 чэрвеня 1926 г. пасля легалізацыі гуртка з’явіўся тэатральны калектыў в. Жодзішкі Вілейскага павета. Першую гадавіну існавання трупа адзначыла буйным святкаваннем з удзелам прадстаўнікоў Беларускага народнага тэатра, які знаходзіўся на гастролях у Вілейскім павеце. У час вечарыны госці паказалі самыя папулярныя на той час п’есы «Мікітаў лапаць» і «Суд», а гаспадары – традыцыйнае святкаванне Купалля.

З сярэдзіны 1930-х гг. палітыка польскай адміністрацыі была накіравана на ліквідацыю на тэрыторыі Заходняй Беларусі нацыянальных арганізацый і ўвогуле на барацьбу з праяўленнямі «беларускасці». Для прыкладу, каб паставіць стары спектакль кшталту «Мікітаў лапаць», трэба было шмат разоў схадзіць да прадстаўнікоў гміннай улады або з’ездзіць да павятовага старасты. Асноўнай прычынай адмоў у пастаноўках беларускіх спектакляў была «пагроза грамадскай бяспецы».

Наяўнасць такой пагрозы для ўлад была відавочная. Напрыклад, у канцы 1930-х гг. каля 200 вёсак Віленскага ваяводства былі ахоплены палявымі даследаваннямі з мэтай вывучэння нацыянальнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

самаідэнтыфікацыі іх жыхароў. Удзельнікі экспедыцыі былі вымушаны канстатаваць рост самасвядомасці сярод беларускага насельніцтва і прасавецкіх настрояў і, наадварот, негатыўных адносін да польскіх улад. Выступаючы на адной з нарад у 1937 г., навагрудскі ваявода Адам Сакалоўскі адзначыў: «Гэтыя землі (заходнебеларускія. – *М. Б.*) моцна адрозніваюцца ад астатніх. Яны не вельмі польскія. Таму іх трэба зрабіць польскімі. Мы заваявалі гэтыя землі штыкамі. <…> Польшча павінна быць адзінай і з'яднанай. Крэсы – гэта Польшча, але калі гаварыць паміж намі, трэба іх заваяваць ізнутры ў другі раз <…> Мы не патрабуем многага, і калі ўжо не могуць змяніць сэрца, то павінны змяніць скуру. Лічу, што <…> беларускі элемент можна змяніць, не спыняючыся перад сілавымі метадамі, калі іншыя не дапамагаюць» [5, с. 59–60].

Такім чынам, мерапрыемствы польскіх улад і дзеянні «крэсавага» чыноўніцтва ў 1921–1939 гг. спрыялі негатыўнаму іх успрыманню насельніцтвам, сфарміраванаму яшчэ ў часы польскай акупацыі ў 1919–1920 гг. Пашырэнню сярод беларускага насельніцтва выразных антыпольскіх настрояў садзейнічала сацыяльна-эканамічная палітыка ўлад, накіраваная на захаванне за ўсходнімі крэсамі статусу сыравіннага прыдатку карэннай Польшчы, архаічнай сацыяльнай структуры. Беларусы ўсходніх крэсаў разглядаліся ў якасці шматмільённага аб'екта асіміляцыі, адным са шляхоў яе стала закрыццё беларускіх газет і школ, перашкоды ў культурным асветніцтве і інш.

*1.* Белоруссия в борьбе против польских захватчиков в 1919–1920 гг. : сб. / подгот. О. Шекун, Р. Кроль, Н. Трусова. – М. : Госполитиздат, 1940. – 191 с.

*2. Борка, А. І.* Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання і самакіравання ў Заходняй Беларусі (1921–1939) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / А. І. Борка ; НАН Беларусі, Дзярж. навук. установа «Ін-т гісторыі». – Гродна, 2007. – 19 с.

*3.* Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Соўр. шк. : Экаперспектыва, 2007–2011. – Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішэвіч [і інш.]. – 2007. – 613 с.

*4. Грицкевич, А. П.* Западный фронт РСФСР 1918–1920. Борьба между Россией и Польшей за Белоруссию / А. П. Грицкевич. – Минск : Харвест, 2010. – 496 с.

*5. Даркович, А. Л.* Городское самоуправление на западнобелорусских землях межвоенной Польши : 1919–1939 гг. : дис. … канд. ист. наук : 07.00.03 / А. Л. Даркович. – М., 2016. – 310 с.

*6. Кузьмич, В. Н.* Белорусский участок советско-польской границы: становление и функционирование в 1921–1939 гг. : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / В. Н. Кузьмич. – Минск, 2011. – 146 л.

*7. Мярчук, В. М.* Эміграцыя насельніцтва з Заходняй Беларусі (1921–1939) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / В. М. Мярчук ; ДНУ «Ін-т гісторыі Нац. акад. навук Беларусі». – Брэст, 2016. – 23 с.

*8. Разуванава, К. С.* Дзейнасць Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры ў Заходняй Беларусі (1926–1936) : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / К. С. Разуванава. – Мінск, 2011. – 148 л.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*9.* Рижский мирный договор 1921 г. // Документы внешней политики СССР : в 24 т. / под ред. Г. А. Белова [и др.]. – М. : Госполитиздат, 1959. – Т. 3 : 1 июля 1920 г. – 18 марта 1921 г. – С. 619–658.
*10. Трубчык, А. Г.* Палітыка польскай улады ў сферы школьнай адукацыі на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1919–1921 гг. : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / А. Г. Трубчык. – Мінск, 2017. – 179 л.
*11. Хаўратовіч, І.* Заходняя Беларусь / І. Хаўратовіч // Энцыкл. гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1996. – Т. 3. – С. 421–425.

*M. Byaspalaya*

**Western Belarus ("Eastern Borderlands"): two decades of trials**

*The article is dedicated to the 80th anniversary of the unification of the Belarusian people in one state. Based on the analysis of inter-war Poland's policy the attempt of the Polish authorities to solve the Belarusian issue on the territory of the Byelorussian SSR occupied during the war (1919–1920) is reflected, the economic and socio-cultural situation in the western provinces is revealed. The role of the Belarusian institute of economy and culture and the Belarusian school society in the development of education and culture is emphasized.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 30.04.2019.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ